Варта ведаць (124)

Аўтар: Рэдакцыя
08.07.2018 00:00

 У базіліцы св. Пятра ў Ватыкане адбыўся звычайны публічны кансісторый, на якім Святы Айцец Францішак далучыў да Калегіі Кардыналаў 14 новых членаў. Кожны з іх атрымаў ад Пантыфіка кардынальскі берэт, персцень і булу з вызначаным тытулярным касцёлам у Рыме (гэта сімвалічнае далучэнне кардынала да прэзбітэрыя Рымскай дыяцэзіі). Намінуючы новых кардыналаў, Папа прызначыў ім таксама тытулярныя касцёлы і дыяконіі. †

 У Ватыкане ў рамках візіту прэзідэнта Французскай Рэспублікі Эмануэля Макрона адбылася яго сустрэча з папам Францішкам. Святы Айцец прыняў прэзідэнта на аўдыенцыі. Падчас размовы былі ўзняты такія глабальныя пытанні, як ахова навакольнага асяроддзя, міграцыя і шматбаковыя абавязацельствы па прадухіленні і ўрэгуляванні канфліктаў. Макрон урачыста прыняў у Ватыкане тытул ганаровага протаканоніка Латэранскай базілікі. Прэзідэнт падкрэсліў, што яго рашэнне прадыктавана імкненнем паглыбіць адносіны са Святым Пасадам, якія могуць служыць справе міру і агульнага дабра.

 Згодна з вынікамі сусветных даследаванняў, праведзеных амерыканскім цэнтрам PEW, Грузія і Гана – адзіныя краіны свету, дзе людзі ва ўзросце ад 18-ці да 39-ці гадоў больш набожныя, чым людзі, старэйшыя за 40 гадоў. Асабліва вялікае разыходжанне паміж малодшымі і старэйшымі вернікамі на карысць апошніх выяўлена ў ЗША, а таксама ў Польшчы, Грэцыі, Чылі, Румыніі і Партугаліі. Даследчыкі робяць вывады, што кожнае наступнае пакаленне ў стабільна развітым грамадстве будзе менш рэлігійным, чым папярэдняе.

 Урачыстасць Нараджэння Яна Хрысціцеля арыгінальна адзначаецца ў Аліага, што ў 100 км на поўнач ад сталіцы Філіпінаў. Па словах мясцовага святара Элмера Віламаёра, гэтая традыцыя бярэ пачатак у 1944 годзе, калі мясцовыя жыхары былі выратаваны ад расстрэлу падчас акупацыі японцаў (пайшоў моцны лівень). Людзі палічылі, што абавязаны сваім выратаваннем св. Яну, які хрысціў Збавіцеля вадой. У памяць аб гэтай падзеі ўдзельнікі цырымоніі змазваюць свае целы брудам і накрываюць іх лістамі бананаў. Затым мыюцца і ідуць на св. Імшу.

 Англійская фірма “Butler & Butler”, якая шые вопратку для духавенства, выпусціла першую сутану з высакаякаснага поліэстэру, атрыманага з 100% перапрацаванага пластыка. Ідэя вытворчасці – следства вялікай цікавасці, выкліканай дакументальным фільмам BBC пад назвай “The Blue Planet” (“Блакітная планета”), дзе ўвага

засяроджваецца на ўплыве дзейнасці чалавека і згубнага пластыка на экасістэмы. Падчас мінулага Вялікага посту Касцёл Англіі заахвочваў вернікаў увогуле адмовіцца ад выкарыстання пластыкавых вырабаў.

credo.pro; ekai.pl; niedziela.pl